# ТЫП КАВАЛЯ ЯК НОСЬБІТ РЫСАЎ «СВАЙГО ЧУЖОГА»

**У. М. Сахарук**

*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, вул. Войкава, 21,
225404, г. Баранавічы, Беларусь, ulanasaharuk@gmail.com*

На аснове аналізу тэарэтычных крыніц (Ю. Лотман, М. Эліядэ) актуалізавана паняцце «свайго чужога» як носьбіта спецыяльных ведаў і таленту; выяўлены сакральная сувязь паміж прафесійнымі заняткамі каваля і шамана, прычыны дваістых адносін да кавалёў, а таксама некаторыя аспекты падабенства паміж рамяством каваля і стварэннем эпічнай паэзіі. Даказана, што ў мастацкай літаратуры тып каваля суадносіцца з тыпамі сейбіта і паэта і мае рысы культурнага героя.

***Ключавыя словы:*** каваль; свой/чужы; спецыяльныя веды; эпічная паэзія; культурны герой.

Каваль – адна з самых таямнічых асоб у жыцці беларуса, увасобленая ў паданнях, легендах і казках, апавітая шматлікімі забабонамі. Гэтая традыцыя прасочваецца і ў арыгінальнай творчасці беларускіх аўтараў. Пастаць каваля небеспадстаўна вылучаецца сярод іншых вясковых тыпаў найперш тым, што менавіта кавалі стаялі ля вытокаў цывілізацыі. Яго прафесійная магія зусім не падобна да той, што сустракаецца ў пастухоў ці млынароў, а зближаецца хутчэй з магічнымі элементамі ганчарства, гэтак жа, як і кавальскае рамяство, звязанае са стыхіяй агню.

Гэты майстар, мастак, чарадзей уладарыць над агнём і жалезам, выробляючы рэчы, якія не можа зрабіць звычайны чалавек. А як сцвярджае Ю. Лотман, усякая творчая дзейнасць або далучэнне да спецыяльных ведаў традыцыйна ўяўлялася, з аднаго боку, якасцю карыснай, а з другога – небяспечнай, бо ўтойвала пагрозу і выводзіла чалавека за межы яго соцыуму, нават успрымалася як далучэнне да іншасвету. Такім чынам, той, хто атрымлівае спецыяльныя веды, апынаецца ў пазіцыі «свайго чужога».

Адзін з раздзелаў кнігі М. Эліядэ «Шаманізм. Архаічныя тэхнікі экстазу» (1951) мае назву «Шаманы і кавалі». На яго думку, рамяство каваля па значнасці ідзе адразу пасля шамана. «Каваль і шаман – з аднаго гнязда», – кажа якуцкая прыказка. На аснове вывучэння міфаў народаў Поўначы філосаф і этнолаг прыйшоў да цікавых высноў. Так, некаторыя спецыфічныя абрады бурацкіх кавалёў дэманструюць, што яны, як і шаманы, з'яўляюцца «ўтаймавальнікамі агню». Якуты ставяць кавальскае рамяство па значнасці непасрэдна пасля шаманства, прыпісваючы кавалям здольнасці лекаваць і прадказваць будучыню. А паводле вераванняў далганаў, шаманы не могуць «глытаць» душы кавалёў, бо тыя захоўваюць іх у агні. Каваль жа, наадварот, можа авалодаць душой шамана і спаліць яе.

Як і дзейнасць шамана, прафесія каваля звычайна спадчынная. Яна перадавалася з пакалення ў пакаленне і ў беларусаў. Сын каваля ў кузні назіраў за працай дарослых і паступова далучаўся да пасільнай працы. Уменне надаваць металу патрэбную форму здавалася нашым продкам чымсьці звышнатуральным, невытлумачальным, і яны надзялілі кавалёў рысамі, характэрнымі для асілкаў і волатаў. Тып каваля найбольш уласцівы персанажнай сферы чарадзейных казак, у якіх адлюстроўваецца барацьба чалавека з сіламі прыроды або канфлікт простага чалавека з ліхім. І ў вырашэнні гэтых канфліктаў істотную ролю адыгрывае каваль, які бясспрэчна паўстае як пазітыўны вобраз, увасабляе велічную сілу і чарадзейныя якасці.

Улада над агнём і металам стварылі кавалям рэпутацыю грозных ведзьмакоў, з чаго вынікаюць дваістыя да іх адносіны: кавалёў адначасова і шануюць, і пагарджаюць імі – што, на думку М. Эліядэ, асабліва яскрава выяўляецца ў народаў Афрыкі. Успрыманне каваля як чужога ўзмацнялася яшчэ і тым, што кузня звычайна размяшчалася па-за паселішчам.

Гаворачы пра ўспрыманне кавалёў як чужых, можна згадаць героя біблейскіх міфаў, сына Адама і Евы Каіна, імя якога этымалагічна і семантычна значыць «каваль». Пасля забойства Каінам брата Авеля, Бог праклінае яго, выганяе з зямлі, у выніку чаго Каін будзе «беспрытульным вандроўнікам». Але ў тэксце можна ўбачыць згадку пра недатыкальнасць і дваістасць асобы каваля: «Калі хто заб'е Каіна, той прыме за гэтую сяміразовую адплату. І Госпад зрабіў Каіну пазнаку, каб ніхто, сустрэўшыся з ім, не забіў яго» [1]. Тувал-Каін, адзін з патомкаў Каіна, займаўся тым, што «каваў усе віды гармат з бронзы і жалеза» [1].

У працы М. Эліядэ «Азіяцкая алхімія» адзначаецца, што «некаторыя аспекты падабенства паміж рамяством каваля і стварэннем эпічнай паэзіі адчуваюцца яшчэ і ў нашы дні на Блізкім Усходзе і ва Усходняй Еўропе, дзе цыганы – кавалі і меднікі – з'яўляюцца адначасова і знаўцамі генеалогіі, паэтамі і песнярамі». На думку М. Эліядэ, гэтая складаная і цікавая праблема патрабуе паглыбленага аналізу, аднак важна адзначыць, што «каваль дзякуючы сакральнаму характару свайго рамяства міфалогіям і генеалогіям, захавальнікам якіх ён з'яўляецца… вылучаецца на важную ролю ў стварэнні і распаўсюджанні эпічнай паэзіі» [2].

Адметным беларускім «штрыхом» да партрэта каваля як творцы і стваральніка эпічнай паэзіі з'яўляецца вобраз легендарнага крошынскага каваля Паўлюка Багрыма. Яго асобе паэт і мастак з Баранавіч Венанцы Бутрым прысвяціў паэму «Ліра і Горан». Твор з'яўляецца своеасаблівай мастацкай біяграфіяй Паўлюка Багрыма. Аўтар адзінага прыжыццёвага верша, вярнуўшыся з рэкрутаў, бярэцца за пяро, адначасова працуючы кавалём у роднай вёсцы. У паэме паказана, як ён ганарыцца сваёй працай,

падкрэсліваецца таленавітасць майстра. Разам з тым варта дадаць, што функцыя рэкрута, паводле сцвярджэння Ю. Лотмана, таксама была своеасаблівай разнавіднасцю ізгойства (яшчэ адной іпастассю тыпу «чужога»). Сыход у рэкруты нават атаясамліваўся са смерцю, а сам рэкрут – з нябожчыкам. Гэты матыў адчувальны ў вершы «Зайграй, зайграй, хлопча малы…», які прыпісваецца аўтарству Паўлюка Багрыма. Ю. Лотман таксама звязвае адносіны да рэкрутаў і нябожчыкаў праз высвятленне семантыкі слова «адпеты»: кандыдату ў рэкруты, часам задоўга да здачы, дазвалялася ўсё, кажучы іншымі словамі, «давалася права рэалізоўваць нормы антыпаводзін» [3]. Гэта, аднак, не мае адносін да лірычнага героя П. Багрыма.

У адзін з самых складаных перыядаў свайго жыцця У. Караткевіч пісаў у лісце да свайго ўніверсітэцкага выкладчыка Аляксандра Назарэўскага: «…усё роўна трэба сеяць, і каваць, і пісаць вершы» [4, с. 53], падкрэсліваючы гэтым арганічную сувязь паміж майстэрствам каваля і пісьменніка. У вершы «Калі алені адшукаюць вадапой» Анатоль Сыс дадаў да гэтага ланцужка ляснічага і рыбака. Аўтар канстатуе: «Калі памрэ ляснічы, / Калі памрэ каваль, / Калі памрэ рыбак – памрэ паэт» [5, с. 55].

Сувязь паміж тыпамі каваля і пісьменніка выяўлена намі і ў класічных творах замежнай літаратуры. Так, у апавяданні Эміля Заля «Каваль» перад чытачом паўстае «годны працаўнік», рысы аблічча якога цалкам адпавядаюць тыповай знешнасці каваля паводле народных уяўленняў. Тыповасць вобраза падкрэслена яшчэ і тым, што герой не мае асабовага імені. Каваль адданы свайму рамяству, і аўтар-апавядальнік з надзвычайным захапленнем апісвае свае назіранні за працай вясковага майстра: «Я любіў глядзець, як працуе каваль. Гэтая заўсёдная барацьба чалавека з непадатлівым жалезам, якое пад яго рукамі набывала патрэбныя яму формы, захапляла мяне, як хвалюючая драма» [6]. Вясковы каваль у паказе Э. Заля надзелены рысамі не толькі працавітага рамесніка, але і сапраўднага творцы, асобы чуйнай і назіральнай: «Ён любіў лугі і нівы як родных дзяцей: радаваўся, калі над імі ззяла сонца, і пагражаў небу кулакамі, калі яно вылівалася громам» [6]. Непарыўная і сувязь каваля з сейбітам, бо сашнікі, якія каваў ён і сёння, выходзілі з яго кузні ўжо на працягу двухсот гадоў. Такім чынам, падкрэслівае Э. Заля, гэтым ён як бы ўдзельнічаў ва ўсіх ураджаях і лічыў сябе валадаром усёй гэтай зямлі. Таксама каваль паўстае і як культурны герой, нястомны сын свайго стагоддзя, які разам з тым «выкоўваў на сваім кавадле прыладу… што стварае ў агні і грукаце жалеза грамадства заўтрашняга дня» [6]. У гэты час творчы парыў авалодваў і пісьменнікам, які, працуючы, сам імкнуўся палымяным словам змяніць лёс чалавецтва і расплюскаць усё сучаснае зло, як каваль расплюскваў жалеза.

Такім чынам, разглядаючы тып каваля як носьбіта рысаў «свайго чужога», мы выявілі, што рамяство каваля здаўна ідзе па значнасці адразу пасля прафесіі шамана. Улада над агнём і металам стварыла кавалям рэпутацыю ведзьмакоў, якіх адначасова і шануюць, і пагарджаюць імі. Успрыманне каваля як чужога звязана і з тым, што кузня звычайна размяшчалася па-за паселішчам. Таксама існуюць некаторыя моманты падабенства паміж рамяством каваля і стварэннем эпічнай паэзіі, што пацвярджаюць творы мастацкай літаратуры. У прозе і вершах акцэнтуецца арганічная сувязь паміж кавалём, сейбітам, паэтам. Як сведчаць спецыяльныя даследаванні, усякая творчая дзейнасць ці далучэнне да спецыяльных ведаў уяўляліся і карыснымі, і небяспечнымі, бо выводзілі чалавека за межы яго соцыуму ці нават далучалі да іншасвету. Гэтым вытлумачваецца, чаму каваль, што ўладарыць над агнём і жалезам і вырабляе рэчы, якія не можа зрабіць звычайны чалавек, займае становішча «свайго чужога».

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Біблія [Электроны рэсурс]. URL: https://knihi.com/none/Biblija.html (дата звароту: 20.02.2023).

2. *Элиаде М.* Азиатская алхимия [Электронный ресурс]. URL: https://uchebnikfree.com/nauki-tehniki-istoriya/arcana-artis543 (дата обращения: 20.02.2023).

3. *Лотман Ю. М.* «Изгои» и «изгойничество» как социально-психологическая позиция в русской культуре преимущественно допетровского времени («Свое» и «чужое» в истории русской культуры) [Электронный ресурс]. URL: https://historicus.media/izgoi_i_izgoinichestvo_kak_sotsialno_psihologisheskaya_pozitsiya (дата обращения: 22.02.2023).

4. *Караткевіч У.* Збор твораў. У 25 т. Т. 20. Мінск : Мастацкая літаратура, 2022.

5. *Сыс А.* Ц. Званы : вершы / укладальнік В. Шніп. Мінск : Звязда, 2021.

6. *Золя Э.* Кузнец [Электронный ресурс]. URL: http://az.lib.ru/z/zolja_e/text_210_le_forgeron.shtml (дата обращения: 22.02.2023).